Кадры
...ўтама
бібліят...

ультэт падрых-
спецыялістаў у
эйнай справы.
ашай рэспублі-
ыпускнікі
ць таксама у
ных установах
Расіі, Украіны і
мся нашымі
сярод якіх
вукоўцы,
чейшыя
цыянальную
гральную
а Я.Коласа НАН
ю навукова-
эзідэнцкую
кую навукова-
Рэспубліканс-
ую бібліятэку
таксама
палату і іншыя
йныя ўстановы
ыпускнікі
эба адзначыць
нікоў факуль-
а Саюза
упраўлення
а Л.П.Гуляка,
ук, прафесар,
ітарных навук
гадчык аддзела
я", пісьменнік
аны дзеяч
ларусь,
й бібліятэкі

звіцца факуль-
у яго будучы-
кладчыкі
ць працягваць
аў, якія
патрабаванням
факутэце веды
дмуркам у
коў.

# Заснавальніца факультэта



Кафедра бібліятэказнаўства, якая нара-дзілася ў кастрычніку 1944 г., з'явілася заснавальніцай бібліятэчнага факультэта. Першым яе загадчыкам быў выдатны бібліятэказнаўца, што унес вялікі ўклад у бібліятэчнае будаўніцтва рэспублікі, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І.Леніна Іосіф Бенецыянавіч Сіманоўскі. Потым кафедрай бібліятэказнаўства кіравалі Мікалай Цімафеевіч Талкачоў (з 1952 г.), Лілія Адамаўна Дзямешка (з 1958 г.), Капіталіна Гардзееўна Маўрычава (з 1961 г.), Ніна Міхайлаўна Калоска (з 1964 г.), Марыя Іванаўна Пакала (з 1972 г.), Віктар Федаравіч Якіменка (з 1973 г.), Людміла Іванаўна Пятровічава (з 1980 г.), Уладзімір Антонавіч Акуліч (з 1986 г.).

Навуковы патэнцыял кафедры рос паступова. З 1944 па 1967 гг. на кафедры зусім не было людзей, якія мелі навуковыя ступені. Першым выкладчыкам, які абараніў кандыдацкую дысертацыю была Марыя Іванаўна Пакала. Зараз 70% выкладчыкаў кафедры з'яўляюцца прафесарамі і дацэнтамі.

На кафедры вучыцца 7 аспірантаў і 8 суіскальнікаў. Абаронены 2 дысертацыі, 2 падрыхтаваны да абароны.

Выкладчыкамі кафедры выдадзены шэраг падручнікаў і манаграфій: "Н.А.Рубакин" ( К.Г.Маўрычава), "Библиотечные фонды Белорусской ССР" (М.І.Пакала), вучэбны дапаможнік "История библиотечного дела в БССР" (М.І.Пакала), манаграфія "Интернациональное воспитание молодежи" (Л.А.Дзямешка), вучэбны дапаможнік у 3 частках "Бібліятэчнае абслугоўванне" (Л.А.Дзямешка, С.А.Паўлава, Н.В.Клімянкова), даведнік "Бібліятэчная справа ў Рэспубліцы Беларусь" (Р.С.Матульскі), вучэбны дапаможнік па курсу "Бібліятэчныя каталогі" (Н.А.Ляйко, Л.І.Казлоўская, Р.А.Ролева), "Руска-беларускі слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў" (Л.А.Дзямешка, В.Е.Лявончыкаў), "Заканадаўчыя, рэгламентуючыя нарматыўныя і статыстычныя матэрыялы па бібліятэчнай справе" (Р.С.Матульскі), вучэбны дапаможнік "Теория библиотечного дела" (Р.С.Матульскі), дапаможнік "Бібліятэкі і вольны час" (Л.А.Дзямешка).

Кафедра пастаянна ўдасканальвала падрыхтоўку спецыялістаў. З'яўляюцца новыя дысцыпліны, такія, як "Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг", "Фандрэйзінг", "Інавацыйны бібліятэчны менеджмент", "Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк" "Тэхналагічны бібліятэчны менеджмент", "Псіхалогія кіравання", "Офіс-менеджмент", "Бібліятэчная статыстыка", "Паблік рылэйшнз у бібліятэцы", "Самаменеджмент", "Канфліктаі́логія", "Бібліятэчнае краязнаўства", "Бібліятэка і вольны час", "Бібліятэчныя зносіны" і шмат іншых.

Дзякуючы дацэнту У.А.Акулічу быў створаны каледж па спецыялізацыі "Менеджмент інфармацыі бізнесу і бібліятэчнай справы" пры школе № 24. Яго выпускнікі паступаюць адразу на 3 курс нашага факультэта.

Кафедра мае моцныя міжнародныя сувязі з кафедрамі бібліятэказнаўства як у бліжнім, так і ў далёкім замежжы, са школай бібліятэчных і інфармацыйных навук Луізіянскага дзяржаўнага універсітэта, школай інфармацыйных навук і палітыкі ў галіне інфармацыі каледжа грамадскіх сувязей імя Ракфелера універсітэта ў Олбані (Штат Нью-Йорк, ЗША), Кёльнскай, Гамбургскай, Штутгарцкай, Лейпцыгскай (ФРГ), Маастрыхтскай (Нідэрланды), Кардыфскай (Вялікабрытанія), Ольштынскай (Польша) бібліятэчнымі школамі, з Бібліятэкай Кангрэса ЗША і інш.

Дзякуючы намаганням кафедры студэнты рэгулярна праходзяць стажыроўку за мяжой: у 1994 студэнтка стажыравалася ў Кёльнскай вышэйшай школе бібліятэказнаўства і дакументазнаўства, студэнты факультэта праходзілі практыку ў галоўнай бібліятэцы Кардыфа (Уэльс, Вялікабрытанія), у г.Ольштыне і г.д.

Атрыманы шэраг грантаў. Першы быў прысвечаны знаёмству з бібліятэчнай справай Нідэрландаў. Фінансаваў гэты грант фонд "NUFIKS", Міністэрства эканомікі Нідэрландаў.

Другі грант атрыманы на правядзенне міжнароднага семінара "Библиотеки и библиотечное образование в Республике Беларусь и США: конструктивный диалог и сотрудничество", які адбыўся 19 — 23 мая 1997 г. Фінансавала гэты праект амерыканскае міжнароднае агенцтва IREX (International Research and Exchange Board).

Трэці грант быў выдзелены на міжнародны семінар "Перспектыўныя напрамкі развіцця бібліятэчна-іфармацыйнай адукацыі Рэспублікі Беларусь у кантэксце сусветных тэндэнцый" (29 — 31 кастрычніка 1997 г., Мінск).

Выкладчыкі кафедры працуюць на добрым міжнародным узроўні. Яны часта выступаюць не толькі на семінарах і практыкумах у бібліятэках, на курсах павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў, у Інстытуце праблем культуры Рэспублікі Беларусь, але і ў Берлінскім, Варшаўскім, Вяліка-Тырнаўскім Дагестанскім, Маастрыхтскім, Ольштынскім, Сафійскім, Штутгарцкім, Ягелонскім і іншых універсітэтах Еўропы.

*У.А.Акуліч*